# КСЕНІЯ ЗАРЭЦКАЯ



## Маленькі бог

Апавяданне

Зарэцкая Ксенія нарадзілася 10 лютага 2002 года ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці. Першая публікацыя адбылася ў 13 гадоў у часопісе «Волшебный». З літаратурнай прозай друкавалася ў раённай газеце «Кобрынскі веснік» і альманаху «аБДУмана». Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы публікаваліся на старонках часопісаў «Маладосць», «На экранах» і «Бярозка», газет «Культура», «ЛіМ», «Переходный возраст». Студэнтка 4 курса факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

### I

Бог не хацеў на зямлю. Яму было добра ў сваім невялікім доме з выглядам на серабрыстыя аблокі. Ён любіў прачынацца з першымі прамянямі зямнога сонца, варыць сабе каву ў глінянай турцы, рабіць зарадку і толькі потым адпраўляцца па сваіх чароўных справах. Ён праходзіў па алеі кветак, вітаўся з калегамі, якія разбягаліся хто куды, кожны раз падміргваў багіні Захаплення — вельмі ўжо яна была мілая — і без усялякай спешкі заходзіў у Камісію па справах Зямных і Нябесных — вялікі светлы будынак. КПСЗІН — месца працы ўсіх хоць трохі значных багоў, і там вечна стаяў шум, гам, хтосьці крычаў і сварыўся, некаторыя, тыя, што нядаўна вярнуліся з камандзіроўкі на Зямлю, нават плакалі. Бог шуму не любіў, менавіта таму падаў пятнаццаць прашэнняў аб пераводзе з вялікага агульнага офіса ў непрыкметны кабінет у куце першага паверха. Калі ён ужо гатовы быў адправіць шаснаццатае, прыйшоў станоўчы адказ, і цяпер бог з'яўляўся задаволеным уладальнікам маленькай каморкі, большую частку якой займаў стол з нагрувашчанымі на ім папкамі, некалькімі планшэтамі, трыма пустымі кубкамі з-пад гарбаты (каву бог піў толькі раніцай) і агрызкамі рознакаляровых пэндзлікаў. У той дзень, калі яму паведамілі аб камандзіроўцы, бог як раз сканчваў працу над буйным у маштабах яго звыклай дзейнасці праектам.

«Маленькі, зайдзі да мяне ў кабінет»,— такі імэйл ён атрымаў па нябеснай пошце тым знамянальным днём і, ужо прадчуваючы бяду, пайшоў да начальніка.

Маленькім яго называлі ўсе, і не тое каб бог быў супраць. Проста хацелася б мець нейкае больш прыгожае імя, як і ва ўсіх астатніх. Што там даўным-даўно было да? Цяпер ніхто ўжо і не памятае,

# МАРЫНА ВАРАБЕЙ



## Альтэрнатыўная гісторыя Зосі

Фрагменты

Варабей Марына нарадзілася 4 мая 1988 года ў вёсцы Раманаўшчына Мядзельскага раёна Мінскай вобласці. Скончыла Мінскі дзяржаўны тэхналагічны каледж (спецыяльнасць «фатаграфія»), філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, магістратуру БДУ па спецыяльнасці «літаратуразнаўства», аспірантуру пры Інстытуце літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

Працавала ў газеце Мядзельскага раёна «Нарачанская зара», Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту, у інтэрнэт-рэдакцыі Выдавецкага дома «Звязда». Цяпер — малодшы навуковы супрацоўнік сектара гісторыі беларускай літаратуры Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

Творы публікаваліся ў беларускай літаратурна-мастацкай перыёдыцы, на партале Textura.by, у вершаваным зборніку «Параходзік сучаснасці».

*перадспеў да зычлівага чытача*

У свяце, і ў працы, і ў часе спачыну
Спявай, мая светлая Зося.
Прасі і маліся за нашу краіну,
Гукай, мая светлая Зося.

Не ведаўшы зблізку, а толькі ў паперах,
Па версе крануўшы стагоддзі.
Ці будзе тут праўды, ці будзе на веру
Хоць слова, што розум народзіць.

У год, калі Лірнік меў дваццаць чатыры,
Адаму было сорак дзевяць...
Нам гучна спяваць мела гордая ліра —
Узыходзіла зорка спадзеву.

Узыходзіла зорка над Дарагавіцай.
На ўцеху збалелага краю...
Што гэтай маленькай сягоння прысніцца?
Ліцвінская песня старая?

* * *

З хваляў жыцця ты выцягваеш слова,
Сонцам самотным сагрэта,
Хоць бы прайсці гэтай сцежкай нанова,
Што ў тваім вершы апета.

Хай жа акорды мінулага раяць,
Як распавесці ўмела,
Што ты пяснярка нашага краю,
Толькі спявала нясмела.

## Карціна I. Final

— Мамуся, мы тут,— павіталася Эліза.

Па смерці Зосі прайшоў год. Гэтым туманным, вільготным шэрым днём са знічамі і кветкамі да магілы на ўскрайку Бабаўнянскага пагоста завіталі дзяўчаты і жанчына.

— Паглядзіце. Усё зрабілі для маёй сяброўкі,— прамовіла старэйшая з наведвальніц[1].

— Zofja z Mańkowskich Trzeszczkowska poetka Adam M-ski. Ur. 1847 26/XI † 24/IX 1911 w Dorohowicy. Może wiatr pieśni rozniesie po świece pieśń serca, które czuło tak gorąco,— прачытала дзяўчына ў шэрым паліто, з-пад якога выглядаў край белага фартуха.

## Карціна II. Рэгулярная пошта

На двары гулялі тры дзяўчынкі-падлеткі. Соннае жоўтае вечаровае сонца жніўня, што зазірала ў акно, прымушала Зоф'ю жмурыцца і складаць з далоняў брыль над тварам — без ценю заставалася журботная ўсмешка. Жанчына плаўна выйшла са слупа святла, папраўіла аб'ёмныя фіранкі і закрыла твар рукамі.

— Пані Зося, пошта...— забегла ў пакой жвавая кабета.— Што здарылася? Баліць штосьці?

— Не, Адэля, усё ў парадку — паглядзі, якое сонца,— кіўнула паблажліва Зоф'я.

— Пані Зося, ліст, газэта свежая...— спяшалася Адэля.

Зоф'я асцярожна ўзяла пошту з рук сялянкі:

— Адпачывай сёння, Адэлька, я сама вячэру падам дзяўчаткам. Мы дамаўляліся чытаць навіны ўвечары. Разам і ліст ад бацькі на сон. Пакінь на стале. Вось там вазьмі тканіну для тваёй сукенкі, колькі аркушаў паперы, атрамант і пёры. Вазьмі, калі ласка.

— Дзякую, пані Зося. Пабягу. З Богам!

## Карціна III. Гарбата

У пакоі за сталом, засланым белым карункавым абрусам, сядзела дзяўчына, занурыўшыся ў чытанне. Яна пераглядала абшарпаныя аркушы, густа спісаныя акуратным шчыльным почыркам.

— Марыйка, хадзем піць гарбату! — гукнулі з суседняй гасцёўні.

— Іду, мамуся! Іду!

— Эмілія! Эліза! — пачуўся голас з калідора на вуліцу.— Гарбата!

Эмілія і Эліза з кнігамі ў руках выскачылі з альтанкі.

— Мамуся, бяжым!

У вялікім пакоі Зоф'я гатавала гарбату і да гарбаты: белы з пазалотаю імбрычак пускаў носам празрыста-белую пару, блішчэлі філіжанкі, пахла духмяным мёдам і свежым ажынавым канфіцюрам.

— Дзяўчаткі, не даклікацца вас за гэтым чытаннем... Гора ад розуму,— ціха і строга прамаўляла Зося.

— Я ўсё чую! — з гарэзнай усмешкай выбухнула, увайшоўшы, старэйшая, Марыя.— Хіба ж мамуся не ведае, у каго мы гэткія.

— Дзе ж, вы мне кожны дзень нагадваеце, красачкі...— паблажліва адказала Зося.— Сядайце...

Эліза гучна адцягнула крэсла, каб сесці, усе прысутныя зірнулі на яе.

— Даруйце, рук не чую,— стомлена выдыхнула дзяўчына.

Эмілія засмяялася:

— А хто лазіў на яблыню? Таму і баляць рукі, што табе ападу было мала.

— Адэля забараніла трэсці, а апад нясмачны. І ты той наліў ела, аж за вушамі трашчала...— абуралася Эліза.

Зоф'я падала духмяны хлеб і сметанковае масла.

— Дзяўчаты, сілкуйцеся. І праўда, наліў спелы ўжо, хадзіла ў сад. Скажу Адэлі, што пара ўжо добра абіраць, хай хлопцаў сваіх прывядзе — і нам, і ім дастанецца. Шмат

[1] Даследчык Мікола Хаўстовіч у сёмым томе «Даследаванняў і матэрыялаў» прыводзіць сведчанне, што надпіс на надмагіллі быў выбіты праз працяглы час (праз год ці нават больш) па загадзе стрыечнай сястры Зоф'і Тшашчкоўскай пісьменніцы Альдоны Раецкай.

сёлета наліву. Малайчына, Эліза, толькі па дрэвах няма чаго лазіць, яшчэ звалішся. Мілька, скардзіцца непрыгожа.

— Мамуся, я не скарджуся, я папярэджваю. Яніка з Адасём? Віта за Адася замуж хоча. Толькі бацька не пусціць,— пераключылася Эмілія.

— Чаму ж? Адэліны хлопцы выхаваныя, вучацца, старанныя, працавітыя...

— Крычыць: «Далі Пан, не пушчу за селяніна!» А Віта плача, яна ўжо наступным годам і хацела б, як шаснаццаць споўніцца. Дзе там...— з абурэннем працягнула Эмілія.— Мамуся, мы ж не пойдзем замуж за тых, хто нам не даспадобы?

— Не аддам вас нікому, пакуль самі не пачнеце збірацца. Навошта ж калечыць вашыя сэрцайкі, мае яскі,— пяшчотна прамовіла Зоф'я.— Па ўсім відаць, варта яшчэ падгадавацца і падвучыцца.

Дзяўчаты заўсміхаліся. Марыйка хутка зрабіла сур'ёзны выраз твару і прамовіла:

— Мама, я сёння ўжо шмат прачытала, што ты мне пакінула. Гэта добрыя вершы. Не горшыя, чым у дзеда Кандратовіча ці Міцкевіча. Смелыя і прыгожыя. Толькі я не ведаю, чые гэта.

Зоф'я раней не паказвала напісанага дочкам, пісьмом займалася, схаваўшыся ўдзень за хатнімі папяровымі справамі і ліставаннем ці па начох зачыніўшыся ў сваім пакоі. Але яна ўжо цвёрда ведала, што яскі яе падраслі, што можна дзяліцца з імі справай свайго жыцця.

— Красачкі, трэба хутка класціся. Заўтра варта было б выправіцца на кірмаш, паглядзець вам уборы да вучобы. Хутка ўсё распавяду. А цяпер хадзем па ложках — ваш тата ліст даслаў са службы, прачытаем.

Праз колькі хвілін сёстры сабраліся ў спальні. Зоф'я распакавала ліст і спакойна пачала:

«Добры дзень, шаноўная пані Зоф'я, светлыя Марыйка, Ліз і Мілька!

Павінен вам сказаць, што ўдалося адправіць вам грошы і нямала, таму смела не шкадуйце сабе да школы запасаў — рыхтуйцеся да вучобы грунтоўна, набывайце ўсё неабходнае. Марыйка ўсё яшчэ збіраецца ісці ў сёстры міласэрнасці? Ці не перадумала? То вельмі цяжкая праца, час неспакойны, давядзецца бачыць людскія пакуты і боль. І гэта ўсё далёка ад дому».

Зоф'я прапусціла некалькі радкоў, зрабіўшы кароткую паўзу. Прачытала пра сябе: «Ты ж памятаеш, Зоф'я, як было ў ад'ездзе? Не адпускай Марыйкі, можа быць, ёсць на прыкмеце кавалер на мясцовасці, каб пры справе і без вайсковага абавязку?»

Стварыўшы выгляд, што стаміліся вочы, адкашляўшыся, жанчына працягнула:

«Эміліі з Элізай яшчэ ёсць час паразважаць — столькі заняткаў цяпер для дзяўчат.

Пачуваюся добра, наведаю вас у Дарагавіцы на Дзяды. Напішыце, што жадаеце ў падарункі. Можа быць, уборы ці кнігі? Можа, штосьці ў дом?

Спадзяюся, што і вы здаровы, і гаспадарка ў парадку. Тут, у Ноўгарадзе, вельмі ўдаліся гэтым годам яблыкі.

Амаль нікуды не выбіраюся. Дужа шмат працы.

Будзьце здаровы! Чакаю на адказ.

Ваш татусь».

— Мамуся, доўга да Дзядоў чакаць... — выгукнула Эліза.

— Што паробіш — служба. Добра, дзеткі, заўтра ўвечары адкажам. І газеты на заўтра. Адпачывайце. Дабранач.

## Карціна IV. Пратэкцыя

Зоф'я стомлена вярнулася ў пакой і пачала разглядаць стосікі, у якія Марыйка старанна складала аркушы па сваёй, нікому не вядомай сістэме. У галаве закруціліся думкі, як расказаць дзяўчатам пра свой занятак, з чаго пачаць, каб яны правільна зразумелі і прынялі.

— Не горшыя, чым у дзеда Кандратовіча ці Міцкевіча...— прашаптала Зоф'я з ледзь заўважнай усмешкай.— Бач, чытала дзеда Кандратовіча. Ніколі раней даскапала не пыталі пра яго. Трэба ім распавесці...

Жанчына заплюшчыла вочы. Згадала Сыракомлева прысвячэнне, якое было вялікай падтрымкай і гонарам. Праўда, на гэтай падтрымцы ляжаў след пераджы-

тай крыўды, што хлопцы ўсё ж дамагаліся большага поспеху і плёну, працуючы ў літаратуры адкрыта. Аднак, ведаючы лёс Каратынскага, бліжэйшага пратэжэ Людвіка Кандратовіча, Зоф'я больш спачувала, чым магла дазволіць сабе рэўнасць, бо знала ягонае жыццё. Што да жанок, у пэўны момант, пасля думкі пра адкрытасць, Зоф'я пачала хадзіць па пакоі, разважаючы, што магло бы быць, калі б яна выступала ў друку пад сапраўдным імем.

— Хто ж ведае? Ажэшка ў сваё вялікае сэрца бярэ нядолю ўсяго краю, а ў коле адукаваных людзей бяруць у разлік акалічнасці яе асабістага жыцця. Лепш так, лепш, каб ніхто не ведаў[1].

Спакойны сон прыйшоў не хутка.

## Карціна V. Дзед Кандратовіч

На раніцу прыбраныя да кірмашу Зоф'я і дзяўчаты сабраліся да брамы, дзе іх чакалі брычка з кучарам і доўгая дарога.

— Марыйка, памятаеш, згадвала ўчора Кандратовіча? Ці распавядала вам пра яго раней? — запытала Зоф'я.

— Я чытала. У нас багата кніг яго. Ведаю, што пры радзіне, але, відаць, далёкай...

— Часу багата — магу распавесці пра наша знаёмства. Цікава?

Дзяўчаты дружна кіўнулі.

— Родная сястра Людвіка Кандратовіча, Альжбета, выйшла замуж за Антона Раецкага, майго дзядзьку. З гэтае прычыны завязаліся дачыненні паміж нашымі дамамі і ваша бабуля, Міхаліна, бывала частым госцем і ў Тулёнцы, і ў Залуччы.

Памятаю, як напаўтаямніча, напаўрадасна шапталі ў нас пра талент песняра, які ўсё больш і больш развіваўся, і пра-роцтвы пра ягоную вялікую будучыню, а ціхае летуценнае дзіця хапала гэтыя словы і сніла ўжо нейкі зорны сон...

О, гэты прыгожы і разумны дзядзечка Людвік, у якога было столькі кніжак з малюнкамі! Кандратовіч любіў дзяцей, дык браў мяне на рукі і паказваў розныя «святыні» ды іншыя рысункі. Ягоная дачушка Марыня была на год старэйшая за мяне; дазвалялася нам сваволіць ва ўсіх кутках і нават у пакоі самога песняра, які смяяўся з нашага блазнавання, а часам нават падыгрываў на грэбені, каб мы паскакалі...

Тут жа згадаю і Тулёнку, дзе дзядуля быў такі добры і апавядаў пра польскіх каралёў і пра старых багоў (я ўжо ўмела чытаць і начыталася міфалогіі). Па Тулёнцы і Залуччы запомніла і выпадкі пры ўдзеле Вінцэся Каратынскага (які з пяцьдзясят першага працаваў сакратаром Кандратовіча), здаецца, ён граў на скрыпцы, а мы з Марыняю падслухоўвалі за дзвярыма...

Было мне гадоў шэсць, самае большае — сем, калі памерлі тры дачушкі Кандратовіча: Марыня, Вікця і Анэтка...

Мой бацька страшна абураны быў акалічнасцямі выезду з ваколіцы Кандратовічаў, бо сусед паабяцаў Вітгенштэйну (уласніку Залучча і Тулёнкі) больш высокую плату за арэнду.

Пасля таго не раз, пэўна, ездзілі мае ў Тулёнку, але мяне не бралі і я не бачыла ўжо песняра...

Так прайшло некалькі гадоў... Для мяне засвяціла чатырнаццатая вясна жыцця, пара было вучыцца. Выбар упаў на Вільню, на пансіён пані Клячкоўскае, у доме Хаўстайна на Бакштах. Дык паехалі мы ў Вільню, і мая маці па старой знаёмасці спынілася ў Кандратовічаў. Было гэта ў лютым 1861 года.

Абое Кандратовічы прывіталі мяне ў адзін голас, што я прыгадала ім памерлую дачку, і былі да мяне невымоўна добрыя. Ажылі дзіцячыя ўспаміны. Ціхія пакоі песняра, карціны на сценах, чэрап на пісьмовым стале. Стосы кніг і паперы неяк дзіўна на мяне ўплывалі. Нават маркотны стан, у якім я мроіла лірніка, будзіў глыбокі жаль.

[1] Развагі З. Манькоўскай з аднаго з лістоў да З. Пшасмыцкага («Listy...», 20 верасня 1889 г., які цытуецца з сёмага тома «Даследаванняў і матэрыялаў»: «Калі быў колькі гадоў таму ў Варшаве, дык назбіраў нясмачных успамінаў. У коле адукаваных людзей сказалі мне пра тую самую Ажэшку — ненармальная, мела некалькі каханкаў — і гэта ўся ацэнка!»

# ПАЛІНА КОРНЕВА



## Страта

Апавяданне

Корнева Паліна нарадзілася 9 лістапада 2004 года ў Барысаве. Скончыла Беларускамоўную гімназію № 2 г. Барысава. Цяпер студэнтка першага курса лячэбнага факультэта Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Лаўрэат Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу студэнтаў і школьнікаў «БрамаМар», дыпламант Рэспубліканскага конкурсу даследчых работ па беларускай мове і літаратуры і Мінскага абласнога конкурсу літаратурных твораў сярод школьнікаў «Лірнік Міншчыны».

«Гудбай, Америка, о,
Где я не был никогда,
Прощай навсегда,
Возьми банджо, сыграй мне на прощанье...»
*Nautilus Pompilius*

Той дзень меў у маім жыцці выключную важнасць. Я ішла ў цэнтральную раённую бальніцу і сама не верыла: мяне дапусцілі паглядзець на сапраўдную хірургічную аперацыю! Звычайны чалавек можа не зразумець захаплення, у якім бывае студэнт-медык, калі яму раптам пашчасціла праціснуцца ў якое-небудзь аддзяленне. Як у любой ВНУ, большую частку нашага навучання складае тэорыя. Студэнты ад дошкі да дошкі чытаюць вялізныя тамы па клінічных прадметах, вучаць нармальную і тапаграфічную анатомію. Перад калёквіумамі нам часта сняцца добра адпрэпараваныя органы і старонкі з атласаў, дзе ўсё вельмі чыста і прыгожа. Сярэднестатыстычны студэнт-медык трапляе на простую аперацыю недзе ў канцы трэцяга курса і пасля гэтага часта ўпадае ў ступар. Аказваецца, медыцына — зусім не тое, што ты сабе ўяўляў. Праз гэты этап праходзіць кожны з нашай маладой медыцынскай секты. Хтосьці — раней, хтосьці — пазней. Але разуменне сваёй нявопытнасці і бездапаможнасці ўсё роўна надыходзіць. Таму кожны, хто вырашыў звязаць сваё жыццё з медыцынай, вымушаны абіваць парогі бальніц, каб хоць на невялікі час, паміж парамі, зазірнуць у зусім невядомы і цікавы свет. Законы гэтага свету ніколі не надрукуюць у якім-небудзь разумным падручніку.

Менавіта таму, здаўшы сваю першую ў жыцці сесію, я вырашыла зрабіць сабе невялікую імправізаваную практыку. Мішэнню абрала аддзяленне гнойнай хірургіі ў цэнтральнай раённай бальніцы. Пра загадчыка гэтага аддзялення казалі, што ён вельмі паважаны спецыяліст

у нашым горадзе. Спачатку трэба было дамовіцца з ім. Папраўдзе, я вельмі перажывала, нягледзячы на добрыя водгукі. Ну як гэта, такое малое і нягеглае кураня прыйшло прасіцца на аперацыю да самога Карыцкага! Мне было вельмі няёмка і страшна. Раз за разам пракручвала ў галаве магчымыя варыянты нашага дыялогу, думала, як гучаць больш пераканаўча. Аднак строгі вобраз старога хірурга ўсё адмаўляў мне. Памятаю, як доўга шукала сярод аднолькавых зялёных будынкаў той самы. Нарэшце, знайшла патрэбныя дзверы. Адчувала я сябе на дзіва няўпэўнена, а самае непрыемнае — няўклюдна. Быццам бы я раптам стала волаткай і кожны мой крок парушае гадамі ўсталяваны парадак. Але гэтае пачуццё адразу знікла, калі я ўбачыла загадчыка: моцнага, немаладога мужчыну, які ўсміхаўся мне. Мы зайшлі ў яго вялікі кабінет, закладзены кнігамі. Страх нечакана сышоў, і я выпаліла свой спіч, не падрыхтаваўшыся. Маўляў, так і так, мару стаць хірургам з дзяцінства і вельмі прашу дазволу паглядзець на працу спецыялістаў. Васілю Аляксеевічу не прыйшлося нічога мне гаварыць, бо я прачытала згоду ў яго вачах. Яны вылучалі цеплыню, у іх свяціліся жвавыя агеньчыкі-хітрыкі.

Мая любімая настаўніца па беларускай мове заўсёды кажа, што я «еду на хуткім цягніку», які трэба своечасова спыняць. З цягам часу я навучылася рабіць прыпынкі. Але доўга я на іх не затрымліваюся — нясуся далей, часам нават сама не зусім разумею куды, але галоўнае — наперад. У школе некаторыя настаўнікі спрабавалі ўнушыць мне, што не трэба браць да галавы лішняе, бо ёсць школьная праграма, па якой трэба ціхенька ісці. Аднак уціскацца ў інфармацыйныя межы ў мяне не атрымлівалася. Я ляцела на сваім хуткім цягніку наперад. І вось толькі зараз, амаль што ўпершыню, я адчула падтрымку ад чалавека, што абагуліў святы для мяне вобраз добрага ўрача...

У тую зімовую раніцу я ляцела нават не на хуткім цягніку, а на хуткасных крылах, бо аказалася ў аддзяленні раней за абазначаны час на сорак хвілін. Старэйшая сястра правяла мяне ў маленькі пакойчык, дзе я пераапранулася ў хірургічны касцюм. У студэнта-медыка ёсць як мінімум тры рэчы, якія ён запомніць на ўсё жыццё: першы халат, першы стэтаскоп і першы хірургічны касцюм. У гэты спіс можна прывесці яшчэ шмат чаго. Напрыклад, першае накладзенае шво, першае дзяжурства... Але вышэйназваная трыяда — нязменныя ўводзіны для ўсіх, тое, што сімвалізуе твой выбар стаць урачом. Свой хірургічны касцюм я дагэтуль не апранала, у люстэрка не глядзелася. Таму на працягу дня лавіла сябе ў водбліску кожнай шклянкі з ёдам ды любавалася: а калі яшчэ палюбуюся, як не ў васямнаццаць год?

Потым знайшла Васіля Аляксеевіча.

— Зараз правяду цябе ў аперацыйную. Не баішся? — спытаў.

— Не,— адказала я і сама здзівілася, як упэўнена маё «не» прагучала.

Спачатку мы зайшлі ў ардынатарскую. За сталом сядзелі ўрачы, кожны са сваімі паперамі. Я не чакала, што сярод іх будзе столькі моладзі.

— Калегі, да нас прыйшла студэнтка меда, 5 курс, хоча стаць хірургам,— прамовіў загадчык і хітравата ўсміхнуўся.

Хірургі на імгненне адарваліся ад сваіх спраў, слізганулі па мне вачыма і зноў прыняліся за працу: хто чытаць гісторыі пацыентаў, хто пісаць іх. Мае шчокі паружавелі. Ведалі б яны, што да пятага курса мне яшчэ вучыцца ды вучыцца. У сваю рэабілітацыю скажу, што я нікога не падманвала. Проста загадчык сам мяне залічыў да старэйшых студэнтаў, бо менавіта яны звычайна грукаюцца ва ўсе дзверы.

Нарэшце, адбылося самае цікавае — мяне завялі ў аперацыйную. Я ніколі не змагу растлумачыць прыроду кайфу, які атрымліваю ад пахаў бальнічных лекаў, стэрыльных рэчаў. Магчыма, кожны медык па-прафесійнаму наркаман. Можна сказаць, каб працаваць у бальніцы, быць такога роду наркаманам нават трэба. У аперацыйнай прыемна пахла ёдам і свежай бялізнай. Калі я прыйшла, медсёстры ўжо завіхаліся: рыхтавалі поле для аперацый, стэрылізавалі інструменты, накладвалі павязкі пацыентам.

# МАКСІМ ХАЦКЕВІЧ



## Гэта мая рэальнасць

Мініяцюры

Хацкевіч Максім нарадзіўся 5 ліпеня 2001 года ў горадзе Новалукомль Віцебскай вобласці. Скончыў Кашчынскую сярэднюю агульнаадукацыйную школу. Цяпер — навучэнец Барысаўскага дзяржаўнага медыцынскага каледжа. Творы друкаваліся ў штотыднёвіку «ЛіМ».

### Каб сонца не свяціла

Зцемры ў мой сон пранікаюць халодныя дзіцячыя рукі — страчаныя магчымасці, якія не спраўдзіліся ў жыцці. Яны апранаюць на свядомасць пыльны палатняны мяшок, званы рэальнасцю, напоўнены хаатычнымі гукамі і пахам мышыных экскрэментаў.

А мы ляжым, абняўшыся да світанку. Твае валасы, тваё цяпло, твая ўсмешка скрозь сон — гэта мая рэальнасць. Засынаючы і прачынаючыся сярод ночы, мы будзем казаць, што кахаем адно аднаго. Будзем мацней абдымаць адно аднаго, ператвараючыся ў кароткатэрміновы супакой.

Да світанку мы расстанемся — гэта мая рэальнасць. Хваравіты пераход з аднаго стану ў іншы. Я не вампір, але жадаю, каб сонца ніколі не паднялося над гарызонтам. Я жадаю, каб свет пагрузіўся ў каматозны стан і ачуўся не раней, чым я засну ў вечным ззянні тваіх абдымкаў, тваіх валасоў, тваёй соннай усмешкі.

### Галілеі

І сёння таксама Галілеі гараць на вогнішчах... Хлусня апраўдана, праўда каральная. Што, калі Галілеі самі спальваюць сябе агнём праўды?

Мінулае ці будучае — усё гэта сучаснасць, якая існуе, не ведаючы пра календары. Мы затрымаліся ў бясконцым «цяпер», самі таго не заўважаючы.

А калі б заўважалі? Што з таго? Ці мы выбіраем напрамак для вандравання свайго карабля? Ці яго накіроўвае вецер?